МІНСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

220030, г. Мінск вул. Энгельса, 4
www.minsk-region.gov.by
рубрыка «Электронныя звароты»
тэл. 5004125, факс 5174961

МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

220030, г. Минск, ул. Энгельса, 4
www.minsk-region.gov.by
рубрика «Электронные обращения»
тел. 5004125, факс 5174961

30.12.2019 № 11.2-6/22/5527-п/кл

[redacted]
(для інфармавання
іншых асоб)
[redacted]

Аб разглядзе электроннага звароту

Паважаны [redacted]!

Ваш электронны зварот, накіраваны ў Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і пракуратуру Мінскай вобласці, па пытанні зносу будынка Чэрвеньскага раённага краязнаўчага музея ў межах кампетэнцыі разгледжаны Мінскім абласным выканаўчым камітэтам сумесна з Чэрвеньскім раённым выканаўчым камітэтам. Па сутнасці звароту паведамляем наступнае.

У 2014 годзе будынкак Чэрвеньскага краязнаўчага музея быў прызнаны аварыйным і зачынены для наведвальнікаў. У дадзены час вядуцца падрыхтоўчыя работы для будаўніцтва новага будынка Чэрвеньскага раённага краязнаўчага музея, які будзе адпавядаць сучасным патрабаванням у сферы музейнай дзейнасці адносна тэмпературна-вільготнаснага рэжыму захавання і экспанавання музейных прадметаў, стварэння пастаянных і часовых экспазіцый. У новым будынку музея прадугледжаны: канферэнц-зала, выставачная зала для правядзення пастаянных выстаў, тры экспазіцыйных залы. Цэнтральнымі экспазіцыямі музея стануць экспазіцыя краязнаўчай накіраванасці, будуць створаны новыя раздзелы, прысвечаныя жыццеваму і творчаму шляхам выдатных землякоў мастака Х.Суціна і кампазітара С.Манюшка. У музей будзе пераведзена экспазіцыя па этнаграфіі і народнаму побыту, якая зараз размяшчаецца ў в. Іванічы. Спектр паслуг музея будзе значна пашыраны, дзякуючы магчымасці правядзення аўтарскіх сустрэч і “круглых сталоў”, лекцый, прэзентацый і г.д., якія могуць праводзіцца як грамадскімі

аб’яднаннямі, так і іншымі суб’ектамі на платнай аснове. Акрамя таго, згодна праекту, у новам будынку прадугледжаны ўмовы стварэння інклюзіўнай прасторы для наведвальнікаў з абмежаванымі магчымасцямі і асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі.

Пры вырашэнні пытання рэканструкцыі існуючага будынка альбо яго зносу з пабудовай новага музея быў праведзены аналіз аб’ёмаў рамонтна-аднаўленчых работ і новага будаўніцтва. У заключэнні ТАА «Універсальныя будаўнічыя тэхналогіі» (вых. ад 11.06.2018 № 318) аб эканамічных і тэхнічных магчымасцях рэалізацыі аб’екта ў рамках рэканструкцыі альбо новага будаўніцтва будынка музея вызначана, што арыенціровачны кошт пры выкананні рэканструкцыі будынка ў два разы танней, чым ажыццяўленне новага будаўніцтва. Тэрмін выканання работ даўжэй ў тры разы.

У адпаведнасці з пунктам 17 главы 2 Палажэння аб парадку правядзення грамадскіх абмеркаванняў у галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 01.06.2011 № 687, працэдура правядзення такіх абмеркаванняў пры будаўніцтве адзіночных аб’ектаў не прадугледжана.

Адносна надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці іншым будынкам, размешчаным у г. Чэрвені, паведамляем наступнае. Парадак надання культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці рэгламентаваны артыкуламі 90, 91, 92, 93 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс).

Згодна з артыкулам 90 Кодэкса прапановы аб наданні матэрыяльным культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ўносяцца ў пісьмовай форме ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню. Да прапановы аб наданні культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці дадаюцца матэрыялы фіксацыі, навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі культурнай каштоўнасці, а таксама абгрунтаванне неабходнасці надання культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У адпаведнасці з артыкулам 91 Кодэкса фіксацыю, навуковую апрацоўку і мастацкую ацэнку культурных каштоўнасцяў забяспечваюць мясцовы выканаўчы і распарадчы орган абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, іншая юрыдычная асоба, грамадзянін, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, якія ўносяць прапанову аб наданні культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Выкананне гэтых работ праводзяць праектныя арганізацыі, якія ажыццяўляюць распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, навуковыя арганізацыі і музеі, у штаце якіх працуюць

спецыялісты з вопытам работы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны не менш за два гады.

На падставе артыкула 93 Кодэкса паведамляем, што прапанова аб наданні матэрыяльнай культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, якая не адпавядае патрабаванням, прадугледжаным артыкулам 90 Кодэкса, не разглядаецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню і вяртаецца асобе, якая яе ўнесла. Разгляд прапановы аб наданні матэрыяльнай культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ажыццяўляецца на пасяджэнні абласнога савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны не пазней за трыццаць каляндарных дзён з дня атрымання прапановы мясцовым выканаўчым і распарадчым органам абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню. У склад Мінскага абласнога савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, які створаны рашэннем Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ад 2 мая 2017 г. № 341, уваходзяць вядучыя спецыялісты ў галіне гісторыі, археалогіі, архітэктары, прадстаўнікі дзяржаўных органаў.

Крытэрыі для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці вызначаны артыкулам 92 Кодэкса.

Вышэй пералічаныя дакументы ад юрыдычных асоб, грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці «3» катэгорыі гістарычнаму будынку, размешчанаму па адрасе: г. Чэрвень, плошча Свабоды, 8, у Мінскі абласны выканаўчы камітэт не паступалі.

У адпаведнасці з пунктам 6 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» дадзены адказ можа быць абскарджаны ў судовым парадку.

Намеснік старшыні І.С.Маркевіч